# Калейдаскоп

красавік 2021

**Школьная газета №8(28)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

Калейдаскоп
красавік 2021

**Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам.** (Я.Сіпакоў)

**Мова — гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ.** (І.Мележ)

**Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму — на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць — калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны — гэта родная мова.** (З.Бядуля)

**Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоў-бацькоў, якія той жа мовай гаварылі.** (В.Ластоўскі)

**Хто саромеецца роднай мовы, варты таго, каб і яго добрыя людзі саромеліся.** (В.Ластоўскі)

**Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю.** (Ф.Багушэвіч)

**Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет.** (Я.Колас)

**Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю.** (Я.Колас)



# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**красавік 202**

**Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў.** (Ф.Скарына)

**Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць.** (Цётка)

**Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны творы, і гэты твор – мова.** (А.Разанаў)

**Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова.** (А.Крывіцкі)

**Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў.** (У.Караткевіч)

**Беларусь-католік, ці беларусь-праваслаўны павінны то помніць, што ў іх адна Бацькаўшчына – Беларусь, адна мова родная – беларуская, адны звычаі і абычаі, адвеку перадаваныя з пакалення ў пакаленне.** (Я.Купала)

**Там, дзе не шануюць роднай мовы, мялеюць рэкі, нішчацца дубровы, народ той мёртвы, а той край нямы.** (Г.Бураўкін)

**Што ў цябе ёсць, акрамя мовы, з якой складаюцца твае думкі і словы?** (В.Марціновіч)



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**красавік 2021**

**Шануем памяць**

**8 красавіка вучні 11 «А» класа** ў рамках рэалізацыі абласнога праекту **«Мая_Зямля_Прыдняпроўе»** здзейснілі пешую прагулку па месцах баявой славы г.Магілёва і наведалі Алею герояў Магілёўшчыны.

Вучні абмеркавалі подзвігі герояў-землякоў, чые імёны ўшанаваны на шыльдах мемарыялу.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**

**Гульня «БелаВеды»  (інтэлектуальнае спаборніцтва)**

З мэтай пашырэння ведаў пра родны край, беларускую мову і літаратуру; стымулявання цікавасці да беларускай мовы і літаратуры; выхавання пачуцця калектывізму, сяброўства, павагі да суперніка, **14 красавіка ў 4 «А»** класе прайшло пазакласнае **мерапрыемства «БелаВеды» (інтэлектуальнае спаборніцтва).** Вучні працавалі ў камандах, адгадвалі рэбусы і загадкі, перакладалі рускамоўныя словазлучэнні на беларускую мову адным словам, працягвалі беларускія прыказкі ў рыфму, выбіралі правільны варыянт тлумачэння лексічнага значэння слова, узгадвалі назвы прадметаў па-беларуску, успаміналі вершы беларускіх паэтаў, пакладзеныя на музыку. Усе прысутныя яшчэ больш упэўніліся ў тым, як трэба ведаць, любіць і шанаваць мову і літаратуру свайго народа, сваю Радзіму, і як гэта цікава!

**Класны кіраўнік Ваўковіч Галіна Васільеўна**





# Папулярызацыя беларускай мовы



### «Пінскай шляхце» - 155 гадоў

У 2021 годзе мы адзначаем 155-годдзе фарс-вадэвіля «Пінская шляхта» класіка беларускай літаратуры В.Дунін-Марцінкевіча. «Пінская шляхта» — гэта гарэзлівая, смешная і, адначасова, пазнавальная гісторыя на тэму жыцця мясцовай беларускай шляхты.

**22 красавіка для вучняў 11 класаў** была праведзена **віктарына па п'есе**, якая актывізавала веды вучняў па сатырычнай камедыі, а таксама пашырыла веды па гісторыі беларускай літаратуры.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**



### Гульня «Падарожжа па Краіне сінонімаў, антонімаў і амонімаў»

**29 красавіка** ў рамках папулярызацыі роднай мовы **для вучняў 5-ых класаў** прайшла **гульня «Падарожжа па Краіне сінонімаў, антонімаў і амонімаў»**. Вучні з цікавасцю выконвалі наступныя заданні: шукалі гэтыя лексічныя адзінкі ў тэкстах, падбіралі да іх пары, перакладалі словы з рускай мовы на беларускую, узгадвалі сінамічныя фразеалагізмы, знаходзілі "трэцяе лішняе", складалі кластар і інш. Мерапрыемства спрыяла паўтарэнню вывучанага матэрыялу, а таксама павышэнню пісьменнай граматнасці і папаўненню слоўнікавага запасу вучняў.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гарэева В.М.**



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**красавік 2021**

### Фарбы беларускай хаткі

**28 красавіка вучні 5 «Б»** класа наведалі Магілёўскі гарадскі цэнтр культуры, дзе прынялі ўдзел у тэатральна — гульнявой праграме «Фарбы беларускай хаткі». Пазнаёміліся з беларускімі абрадамі і традыцыямі беларусаў. Змаглі пакруціць кола калаўрота і жорнаў, палюбавацца прыгожымі ручнікамі, сурвэткамі, патрымаць у руках верацяно, вілкі, чапялу, зачарпнуць апалонікам у чыгун, даведаліся аб прызначэнні ступы, праса і качалак, паспрабавалі пакачаць ільняны ручнік, агледзелі сялянскі гардэроб.

Дзеці пазнаёміліся са звычаямі дэкаратыўнага аздаблення беларускай хаты, яе традыцыйным інтэр'ерам.

Культурным і адукаваным лічыцца той чалавек, які ведае гісторыю і абрады, мову свайго народа.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т. М.**



# Народныя традыцыі



## Красавік

Назва чацвёртага месяца года паходзіць ад слова ***"красаваць"***, бо ў ім з`яўляюцца першыя краскі-кветкі. Гэтаму адпавядае і другое найменне, што сустракаецца ў старажытнай літаратуры, – **кветень**. У прыватнасці яго ўжывае Ф.Скарына ў "Малой падарожнай кніжцы". Такая форма захавалася ва ўкраінскай мове – **квітень** і польскай – **kwiecień.** У старажытных славян чацвёрты месяц яшчэ вядомы як **беразоль**. А ў чэхаў гэта **duben**, у літаўцаў – **balandis** і г.д. Рускі **апрель** (таксама ў англічан, французаў, немцаў) паходзіць ад рымскага **aprilis**, што азначае "адчыняць". У гэты месяц у Італіі адчыняліся дзверы вясны, распускаліся на дрэвах пупышкі. Для земляробства настае адказны час: падрыхтоўка насення і выбар аптымальнага дня першага ворыва. На яго сяляне некалі ішлі, як на свята, мыліся ў лазні, апраналіся ва ўсё белае, выконвалі прымеркаваныя да тае нагоды абрады, прытрымліваліся павер`яў. Надзейнай прыкметай гатоўнасці глебы з`яўлялася наступнае: сціскалі ў жмені невялікі яе камяк і з сілай разбівалі вобзем. Калі рассыпаўся – "засупоньвай хамут". Пачалі жабы крактаць – выходзь у поле. Жаўрук зазвінеў – бяры саху ў рукі. Не без падстаў у народзе было прынята выязджаць у поле пасля першага грому: следам за ім усталёўваліся цёплыя пагодлівыя дзянькі.

Красавіцкія раўчукі зямлю абуджаюць.

Красавік з вадою - травень з травою. Мокры красавік - добрая ралля.

Красавіцкі шпак - вясны ганец.



# Літаратурная старонка

**Калейдаскоп**
**красавік 2021**

## Красавік

**Полем, лесам, пералескамі,
Па зямлі, вясной абуджанай,
Красавік ідзе з пралескамі
Па праталінах і лужынах.
Раўчукі гудуць напорыста,
Распусцілі вербы голейка,
На галінцы ціхім посвістам
Шпак вітае рана сонейка.
За дарогай, за прысадамі
Млын грукоча гулам-гоманам,
Там жаўрук дадолу падае
У быльнёг сухі, паломаны.
Дзе сасна расце высокая
Па-над рэчкай гаманліваю,
Бусел радуе нас клёкатам,
Прыляцеўшы з далеч-выраю.
І дарогамі і трактамі,
Наўздагонкі нібы гоняцца,
Плуг бяжыць за гонкім трактарам,
Ажно поле гулам поўніцца.
Полем, лесам, пералескамі,
Па зямлі, вясной абуджанай,
Красавік ідзе з пралескамі
Па праталінах і лужынах.**

**Станіслаў Шушкевіч**



# Юбілейныя даты



## 23 красавіка 135 гадоў з дня нараджэння Змітрака Бядулі



Змітрок Бядуля (Самуіл Плаўнік)

**Змітрок Бядуля (Самуіл Плаўнік)** нарадзіўся 23 красавіка 1886 года ў сям’і балагола — возчыка на лесасплаве. Жыла сям’я на Вілейшчыне, у вёсцы Пасадзец. Бацькі аддалі хлопчыка вучыцца ў пачатковую школу, а пазней — у семінарыю. Ра´біна з хлопца не атрымалася: падзарабляючы напісаннем асабістых лістоў ад дзяўчат да жаніхоў, ён наслухаўся рамантычных гісторый і стаў складаць уласныя вершы, прысвечаныя неіснуючай дзяўчыне Мірыям: «Ты мне даражэй за жыццё. Ты — маё неба. Ты — мая зямля. Ты — маё шчасце. Ты звіла навекі гняздо ў маім сэрцы. Мірыям... Мірыям... Я гляджу на зоркі і думаю, што гэта твае вочы. Я слухаю песні салоўкі і думаю, што гэта твой голас». Чуткі пра запісы юнага паэта дайшлі да духоўнага інспектара семінарыі, у якой не ўхвалялася не тое што пісаць — нават чытаць свецкія кнігі. Гэта паслужыла нагодай да выключэння Самуіла.

Хлопец вучыўся самастойна — дома і ў бібліятэцы, падзарабляў хатнім настаўнікам. У дарослым узросце пісьменнік валодаў некалькімі мовамі (беларускай, нямецкай, рускай, ідыш, старажытнаяўрэйскай, крыху польскай), быў вельмі адукаваным чалавекам. У 1902 годзе, падвучыўшыся ў бацькі, малодшы Плаўнік пайшоў працаваць канторшчыкам на лесараспрацоўкі.

Праз дзесяць гадоў Змітрок Бядуля накіраваўся ў Вільню. Якраз на гэты час прыпаў росквіт яго таленту.

Першы апублікаваны ў «Нашай ніве» твор пісьменніка «Пяюць начлежнікі» (1910) — імпрэсіяніcцкі.

У 1913 годзе ў Пецярбургу, у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца», выйшаў яго зборнік лірычных імпрэсій «Абразкі». Калі ў 1914 годзе Купала ўзначаліў «Нашу ніву», Змітрок Бядуля стаў адказным сакратаром рэдакцыі.

# Юбілейныя даты



## 23 красавіка 135 гадоў з дня нараджэння Змітрака Бядулі

У 1915 годзе ён вымушаны быў пераехаць у Мінск. Пачалася Першая сусветная вайна — і Бядуля ўладкаваўся ў Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, зняў кватэру, дзе на два гады прытуліў Максіма Багдановіча.

Падчас рэвалюцыі таленавіты лірык друкаваўся ў газеце «Вольная Беларусь». У гады нямецкай акупацыі Беларусі (1915—1918) Бядуля друкаваўся ў газеце «Беларускі шлях», а пры польска-савецкай вайне рэдагаваў часопіс «Беларускае жыццё».

У савецкі час Змітрок Бядуля супрацоўнічаў з газетай «Савецкая Беларусь» і быў рэдактарам аднаго з першых дзіцячых часопісаў «Зоркі». Выданне стала лагічным працягам той працы, якую праводзіла Цётка ў «Лучынцы» — Змітрок Бядуля актыўна друкаваў у часопісе ўласныя творы для дзяцей, уключаў тэксты пазнавальнага, выхаваўчага зместу Янкі Купалы, Якуба Коласа, Міхася Чарота, Янкі Журбы, таксама песні з нотамі, гульні, народныя казкі, загадкі, прыказкі.

З 1926 года пісьменнік загадваў краязнаўча-этнаграфічным часопісам «Наш край» пры Інстытуце беларускай культуры. У 1923 годзе Змітрок Бядуля ўвайшоў у новастворанае літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», а пазней — ва «Узвышша». Пасля роспуску літаратурных аб'яднанняў быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР.

> Літаратурныя сувязі. У 1921 годзе Якуб Колас прысвяціў Змітраку Бядулю адну са сваіх «Казак жыцця» — «Кучаравае дрэва». Назва была звязана са знешнасцю Бядулі і яго каранямі.

Вялікая Айчынная вайна прымусіла пісьменніка пакінуць Беларусь. Ён апынуўся ў Саратаўскай вобласці, дзе нарэшце злучыўся з сям'ёй, якая з'ехала раней. Здароўе падводзіла — і ў 1941 годзе ва Уральску падчас аднаго з пераездаў, даганяючы цягнік, Змітрок Бядуля памёр ад інфаркту. Хавалі пісьменніка акцёры Другога беларускага дзяржаўнага тэатра (сёння Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (Віцебск)), якія гастралявалі недалёка: яны ўрачыста чыталі яго творы каля труны.

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**красавік 2021**

## *СКАРБЫ МОВЫ - ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ*

***Фразеалогія* – цікавы і самабытны пласт беларускай лексікі. Вывучэнне, а затым і выкарыстанне ў маўленні фразеалагізмаў дапамагае зрабіць мову выразнай, вобразнай і эмацыянальнай.**

Пры вывучэнні фразеалагізмаў у вучняў узнікае пытанне: навошта мы вывучаем гэтую тэму? Адны вучні на гэтае пытанне адказваюць, што фразеалагізм – гэта спалучэнне слоў як адно цэлае, якое мае пэўнае значэнне, і калі чалавек умее іх выкарыстоўваць у мове, то гэта гаворыць пра яго адукаванасць, пра глыбокае веданне мовы. Умее выкарыстоўваць фразеалагізмы толькі чалавек з багатай душой. Фразеалагізмы, нібы рэдкія каштоўныя камяні, упрыгожваюць і паляпшаюць нашу мову. Як трапна можна сказаць, ужыўшы фразеалагізмы лебядзіная песня, першая ластаўка, аднаго поля ягады, чалавек з адкрытай душой.

***Чаму мы так гаворым?***

**Ставіць кропкі над "і"**

***Мабыць, вы не аднойчы пры хуткім пісьме над літарай і не ставілі кропкі, бо лічылі рабіць гэта не адразу нязручным:трэба было адарваць стрыжань ад ліста, падняць яго ўверх і паставіць кропку. Каб усё ж не прапусціць гэту памылку, даводзілася напісанае перачытваць, дапісваць прапушчанае, ставіць кропкі над "і".***

***На сённяшні час выраз ставіць кропкі над "і" ўжываецца ў пераносным значэнні – "удакладняць усе падрабязнасці ў любой справе, не пакідаючы нічога недагаворанага, недаробленага, давесці ўсё да канца".***

**На злодзеі шапка гарыць**

***Гавораць пра чалавека, які зрабіў штосьці дрэннае, маючы на ўвазе, што "той, хто вінаваты, сваімі паводзінамі выдае сябе". Гісторыю з'яўлення гэтага выразу звязваюць з незвычайным анекдатычным апавяданнем. У далёкія часы ў невялікім мястэчку здарылася пакража. Абкрадзеныя звярнуліся да знахара. Той, уважліва выслухаўшы і нічога не сказаўшы, павёў іх на базар і крыкнуў: "Гэй! Паглядзіце шапка гарыць!" Злодзей мімаволі схапіўся за шапку і гэтым выдаў сябе.***

**Як га**

***Уласнабеларускі фразеалагізм мае значэнне 'вельмі хутка'. Магчыма, выраз паходзіць з параўнальнага звароту як "га" сказаць (крыкнуць).***

***Унутраная форма фразеалагізма, як сцвярджаў беларускі мовазнавец Ф.М. Янкоўскі, усведамляецца так: "хутка, як крыкнуць, як сказаць га".***

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**красавік 2021**

---

***СКАРБЫ МОВЫ - ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ***

**Бібікі біць**

**У некаторых беларускіх гаворках слова *бібікі ўжываецца ў значэнні 'гузікі'. Гэта дае падставу даследчыкам мовы меркаваць, што першапачаткова бібікі біць мела значэнне 'гуляць у пэўную гульню з гузікамі'. Пазней выраз пачаў ужывацца ў значэнні 'гультаяваць, бяздзейнічаць, займацца пустой бескарыснай справай'.***

**Сесці ў галёш** – ***пацярпець няўдачу, апынуцца ў смешным становішчы***

**Кракадзілавы слёзы** – ***пра няшчырае, прытворнае шкадаванне, спачуванне***

**Як баран на новыя вароты** - ***выглядаць разгубленым, засаромленым; глядзець з дурным выглядам***

**З'есці пуд солі** - ***вельмі добра ведаць нейкага чалавека, перажыўшы з ім розныя жыццёвыя сітуацыі***

**Як з гусака вада** - ***нішто не хвалюе, не кранае, нішто не дзейнічае***

**Спаць без задніх ног** - ***вельмі моцна, непрабудна***

**Купіць ката ў мяшку** - ***набыць што-то за вочы, не ведаючы нічога аб недахопах або вартасцях пакупкі***

**Трымаць рот на замку** - ***не балбатаць лішняга, быць нешматслоўным***

**Белая варона** - ***аб тым, хто рэзка адрозніваецца ад іншых, не падобны на навакольных***

**Стрэляны верабей** - ***дасведчаны чалавек, якога цяжка або нават немагчыма падмануць***

**Шчокі гараць ад сораму** - ***пачырванець ад сораму***



Рэдкалегія: Аліева Анастасія (8в), Кузьміна Кацярына (8в), Прасаловіч Юлія (8в), Сарокіна Вікторыя (8в), Федарэнка Вікторыя (8в).
Рэдактар Юрчанка С. А.